УДК 94 : 762.5 (476.4)

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ ХРАМЫ XVII–XVIII стст. У ГОРАДЗЕ БЫХАВЕ

**Галынскі Раман Дзмітрыевіч**
Магілёўскі інстытут Міністэрста унутраных спраў Рэспублікі Беларусь
(г. Магілёў, Беларусь)

*Адной з састаўных частак паўсядзённага жыцця чалавека часоў Сярэднявечча і Ранняга Новага часу з'яўлялася рэлігія, а культавыя пабудовы фарміравалі яго штодзённае асяроддзе. Зыходзячы з гэтага прапануем разгледзіць як эвалюцыянавалі хрысціянскія культавыя пабудовы горада Быхава XVII–XVIII стст.*

Адным з найважнейшых элементаў, што фарміруюць паўсядзённасць, выступае жыццёвая прастора населеных пунктаў. Важным элементам якой з'яўляюцца культавыя пабудовы. Гэта і рэлігійныя, і сацыяльныя, і эканамічныя і, нават, абарончыя дамінанты. Разгледзім жа ў гэтым рэчышчы эвалюцыю хрысціянскіх храмаў на тэрыторыі горада Быхава XVII–XVIII стст.

**Каталіцкі касцёл** канонікаў рэгулярных латэранскіх беззаганнага зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны, Святога Казіміра і Святога біскупа доктара Аўгусціна размяшчаўся на поўнач ад замкавага комплекса. Быхаўскі касцёл уваходзіў у Аршанскі дэканат. Чацвёра манахаў былі выпісаны у Быхаў з Кракава Янам Каралем Хадкевічам у 1618 г. Менавіта яны і сталі першымі служачымі згаданага касцёла.

На малюнку Л. Куўро сярэдзіны XVII ст. [1, с. 16–24] касцёл паказаны як мураваны будынак. Ён пераҗыў шмат пажараў у сярэдзіне XVII–XVIII ст., што адбілася на яго аблічча. Першапачаткова ён быў драўляны, але падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (далей – РП) 1654–1667 гг. будынак згарэў і быў перабудаваны ў каменны. Потым ён гарэў і ў 1702 і ў 1765 г. Пасля апошняга пажару касцёл стаў фарным [10, с. 43]. Верагодна, абшчына выдаткавала грошы на адбудову. У XVIII ст. яго перабудавалі адпаведна новай традыцыі ў будаўніцтве касцёлаў у РП [10, с. 58].

Па назіраннях І. М. Слюньковай, для Верхняга Падняпроўя былі характэрныя касцёлы з бяскупальнымі двухвежавымі храмамі, якія размяшчаліся ў глыбіні комплексу за агароджай [10, с. 57].

Згодна з планам горада 1781 г. пад касцёл быў адведзены асобны квартал з цэлым компексам пабудоў. У яго ўваходзілі: сам будынак касцёла, званіца, келлі (на малюнку пазначаны як кірха латэранскіх канонікаў), згадваюцца кухня, вазоўня, стайня, бровар, піўніца [7, с. 24б], акрамя таго – студня [7, с. 25]. Комплекс быў абкружаны каменнай агароджай з кутнімі вежамі і фахверкавай ці драўлянай зрубнай брамай са званіцай.. Усе будынкі, акрамя кірхі, былі зруйнаваны да 1960-х гг. Адзначым, што на фотаздымках XX ст. брама ў касцёльнага комплексу мураваная і на ёй усталявана акно, на месцы якога мог быць і гадзіннік. Перабудова брамы хутчэй за ўсё адбылася ў XVIII ст. [5 с. 78–81; 9, с. 395; 11, с. 48; 3, с. 112–114; 2]

**Праваслаўны храм** Святога Георгія займаў цэнтральную частку горада, а царква знаходзілася на пасадзе (за абарончымі ўмацаваннямі). Тут маецца на ўвазе так званыя “цёплы” і “халодны” храмы. Дакладна не вядома, якому святому быў прысвечаны гэты храм, але тэрыторыя, на якой яны знаходзіліся, называліся Юраўка і Заюраўская слабада. Гэта ўказвае на прысвячэнне культавых пабудоў у гонар Святога Георгія. Галоўны будынак быў каменны і атынкаваны, а званіца – драўлянай. [3, с. 112–114]. На малюнку пачатку XIX ст. з “Карта Беларуска-Магілёўскай губерніі і віды Губернскага і Уездных Гарадоў з прысвоенымі ім гербамі” (далей – “Карта Магілёўскай губерніі…”) храм намаляваны як мураваны будынак з пяцццю купаламі [8].

Магчыма, наяўнасць у непасрэднай блізкасці двух аднолькавых рэлігійных збудаванняў можна растлумачыць вялікай колькасцю прыхажан (адзін храм абслугоўваў мяшчан, другі – пасадскіх жыхароў). У Інвентары 1785 г. згадваецца “Rynek z Cerkwia S: Troycy oraz z dawnym Cerkowiszem Kramami …” (рынак з Царквой Св.Тройцы разам са старым царкавішчам і крамамі). Не ясна пра які будынак ідзе гаворка (ці гэта праваслаўны храм, ці былы ўніяцкі). Наступная згадка рэлігійнага аб’екта прыведзена так: “Pod Cerkwia Dyzunicka…” (пад Царквой Дызуніцкай (праваслаўнай)) [6, л.5-1–5-2], гэта праваслаўная царква знаходзілася на вуліцы, што ішла ад гандлёвай плошчы да Навабыхаўскай бра-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мы (будынак, які пазначаны на малюнку Л.Куўро як праваслаўны храм). Пры дадзеным храме ў канцы XVIII ст. існаваў “шпіталь”, што дэманструе забеспячэнне пэўнай сацяльнай бяспекі ў горадзе.

Будынак быў разбураны ў сярэдзіне XIX ст.

На заходнім ускрайку горада на гандлёвай плошчы была пабудавана **ўніяцкая царква**. Яна адлюстравана на маюнку Л. Куўро як будынак са званіцай фахтверкавай канструкцыі. Такая тэхналогія не характэрна для Падняпроўя, эпізадычна сустракаецца ў Заходняй Беларусі, то хутчэй за ўсё гэта спецыфіка адлюстравання драўляных пабудоў, бо аналагічна прамаляваны званіцы касцёла і праваслаўнага храма [3, с. 112–114]. На малюнку “Карты Магілёўскай губерніі…”, верагодна, пад уніяцкай царквой намалявана “приходское деревянное училище” [8]. На планах горада XIX ст. згаданы аб’ект адсутнічае.

На планах перабудовы горада Быхава канца XVIII – пачатку XIX ст. каля фальварку Белая Гара (належаў касцёлу) пазначана царква (гэтак званая “паўночная”). Пакуль што мы не маем звестак пра згаданы аб’ект.

Пры згаданых храмах існавалі і могілкі [4, с. 34–36].

Падсумоўваючы, выпадае кансатаваць наяўнасць у г. Быхаве XVII–XVIII стст. Праваслаўных (не меньш 2-х), каталіцкага і ўніяцкага храмаў, што месціліся амаль на адной гандлёвай плошчы. Храмы, за выключэннем уніяцкага, мелі паўнавартасныя гаспадарчыя комплексы, у асноўным мураваныя, ці фахверкавыя. Ні адзін помнік да нашых дзён не захаваўся, акрамя будынка келляў касцёла.

## Літаратура


1. Волкаў, М. А. Быхаў у першай палове XVII ст. / М. А. Волкаў // Сапегі: асобы, кар’еры, маёнткі : зб. навук. арт. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – С. 167–194.

2. Галынскі, Р. Д. Да пытання аб узнікненні паселішча Быхаў (канец XIV – пачатак XVI ст) / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – X : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилёв : ГУК “Быхов. район. ист.-краевед. музей”, 2021. – С. 7–12.

3. Галынскі, Р. Дз. Культавыя пабудовы Старога Быхава ў XVI–XVIII стст. / Р. Дз. Галынскі // Религия и общество – 10 : сб. науч. ст. / под общ. ред. В. В. Старастенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – С. 112–114.

4. Галынскі, Р. Дз. Некропалі Быхава / Р. Дз. Галынскі // МАБ. – Мінск, 2018. – № 29. – С. 34–36.

5. Грыцкевіч, А. П. Каталіцкі касцёл у Магілёве і на Магілёўшчыне ў XVII–XVIII стст. / А. П. Грыцкевіч // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва : зб. навук. пр. / уклад. І. А. Пушкін. – Магілёў : УПКП «Магілёўск. абл. ўзбуйнёная друк.», 2001. – С. 78–81.

6. Інвентар Быхаўскага графства // Бібліятэка Чартарыйскіх у Кракаве / Klucz bychowski (Bychow). – 9119 Pol. 1797. 42,5 x 33 cm. K. 82. Opr. Sk.

7. Інвентар Быхаўскага касцёла // Нац. гіст. архіў Беларусі. – Ф. 2395. Воп. 1. Спр. 7.

8. Карта Белоруско-Могилевской губернии и виды Губернскаго и Уездных Городов с присвоенными им гербами / Могилевский Губернский Землемер Коллежский Советник и Кавалер Лада Клодницкий. – [Могилев, первая половина XIX в.]. – 1 к. (1 л.) : цв., раскраш., акварель, рукопис., стат. свед., табл., ил.; 98×65 см.

9. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы Беларусі / А. М. Кулагін ; фатограф А. Л. Дыбоўскі. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 488 с.

10. Слюнькова, И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. / И. Н. Слюнькова. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с. : ил.

11. Шкапляроў, Ю. П. Старабыхаўская крэпасць у XVII ст.: архітэктура і арганізацыя абароны / Ю. П. Шкапляроў, Р. Д. Галынскі // Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манагр. / Ю. П. Шкапляроў, М. А. Волкаў, Р. Д. Галынскі ; пад навук. рэд. І. А. Марзалюка. – Магілёў : Магілёўс. ін-т МУС, 2018. – С. 33–80.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова